цыяльныя навучальныя установы культуры і мастацтва, мэтазгодна ўстанавіць тэрмін навучання ва універсітэце на ўзроўні бакалаўра тры гады. Практычна гаворка ідзе аб тым, што яны могуць паступаць на другі курс са здачай аснoўных экзаменаў за 1 курс, прадугледжаных іх спецыялізацыяй. Для таго каб ажыццявіць гэтую меру, неабходна перагледзець вучэбныя праграмы гэтых навучальных установ, сумясціць дадзеныя праграмы з планамі прафесійнай і агульнагуманітарнай падрыхтоўкі нашай навучальнай установы.

Асобы, скончыўшыя сярэднюю школу або сярэднюю спецыяльную навучальную установу не па профілі культуры і мастацтва, для атрымання адукацыі ў Беларускім універсітэце культуры на ўзроўні бакалаўра па вочнай форме навучання (па любой спецыяльнасці) павінны вучыцца не больш чатырох год. Бакалаўры, якія прэтэндуюць на кваліфікацыйную ступень магістра, пасля спецыяльнага псіхолага-педагагічнага тэсціравання і гутаркі з імі па культуралагічных або іншых профільных дысцыплінах, кваліфікацыйнага прафесійнага адбору, ажыццяўляемых спецыяльнымі камісіямі, дапускаюцца да далейшага навучання тэрмінам яшчэ на адзін год для атрымання шукаемай ступені.

Тыя з іх, хто атрымаў магістэрскі дыплом з адзнакай, маюць права паступаць у аспірантуру без уступных экзаменаў і без стажу работы па спецыяльнасці.

Аспіранты дзеннай формы навучання, якія абаранілі кандыдацкія дысертацыі на працягу тэрміну навучання ў аспірантуры і якія раней мелі пяцігадовы стаж педагагічнай работы, могуць быць накіраваны ў дактарантуру універсітэта адразу пасля атрымання дыплома кандыдата навук. Калі ж аспірант вочнай формы навучання, які своечасова абараніў дысертацыю, не мае стажу педагагічнай работы, ён атрымоўвае гэтае права пасля пяці год выкладчыцкай дзейнасці.

Так у агульных рысах можна ўявіць мадэль чатырохступеньчатай прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у Беларускім універсітэце культуры.

Фундаментальнай асновай гэтай падрыхтоўкі з'яўляецца культуралогія - шматмерная, разнастайная навука аб будове, відах, тыпах матэрыяльнай і духоўнай культуры, аб агульных заканамернасцях, гістарычных этапах яе развіцця, формах трансляцыі і сацыяльнага асваення.

Культуралогія - гэта глеба, на якой вырастаюць і пераплятаюцца ва універсітэце дрэвы мастацтваў, прафесійныя мастацкія навукі і метады іншых гуманітарных навук і дысцыплін.

Ракава В.К.,
выкладчык

## АДУКАЦЫЯ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ І НАКІРУНКІ ЯЕ РЭФОРМЫ

Парадаксальна, але факт: рэфарміраванне адукацыі ў апошнія дзесяцігоддзі ў былым Саюзе, у апошнія гады ў нашай суверэннай дзяржаве здзяйсняецца шляхам змянення форм і ўмоў адукацыі, але амаль не закранала і не закранае галоўнага ў адукацыі - яе зместу. Між тым менавіта мадэрнізацыя і радыкальнае паляпшэнне зместу адукацыі - чаму вучыць і чаму вучыцца - уяўляе галоўную мэту рэформ у гэтай сферы. Тым не менш можна сцвярджаць, што рэформы зместу адукацыі не абазначылі нават іх нулявы цыкл.

Аналагічнае становішча і з рэформай адукацыі ў галіне культуры. Яна ідзе тут хаатычна, метадам кан'юктурна-модных тыкаў, пачварна дэфарміравана палітызацыяй і камерцыялізацыяй культуры.

У шырокім сэнсе культура ўяўляе ўсё, што было і будзе створана чалавекам, народамі,чалавецтвам у цэлым у інтэлектуальнай, духоўнай і матэрыяльнай сферах. Ствараючы культуру, чалавек, у сваю чаргу, з'яўляецца яе прадуктам. З гэтага вынікае неабходнасць яго адукацыі ў галіне культуры, гэта значыць авалодання ім усёй сумай дасягненняў чалавецтва ў мастацтве, навуцы, рэлігіі, філасофіі, архітэктуры, палітыцы, праве, развіцці рамёстваў і г.д.

Сутнасць культуры абумоўлівае і напрамкі яе вывучэння. Гэта, па-першае,вывучэнне гістарычных і сучасных дасягненняў культуры сваёй дзяржавы. Да апошняга часу мы знаходзіліся ў вялікай недасведчанасці, мала, а ў некаторых напрамках амаль не ведалі ўласных нацыянальных культурных каранёў, традыцый, дасягненняў. Тое ж, што ведалі, не ў поўнай меры ацэньвалі. Між тым намаганні нацыянальных рэфарматараў нават у апошнія гады, пасля зняцця ідэалагічных табу і догм, паказалі, што Беларусь і яе народ валодаюць багатай культур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нан спадчынай: створанымі шэямі, цікавымі рамеснымі вырабамі, выдатнымі помнікамі, рэлігійнымі і свецкімі святынямі, цудоўнай вуснай творчасцю і народнымі звычаямі, паданнямі, міфамі, легендамі, песнямі і танцамі. Гэта спадчына ўяўляе творчую душу народа, выснову яго сучасных і будучых дасягненняў.

Набіраючае сёння сілу культурнае адраджэнне на Беларусі мае сваёй мэтай не толькі адраджэнне ў поўным аб'еме яе тысячагадовай культуры, але і больш прадуктыўную,на базе адроджанай культуры, поўнамерную адукацыю усяго народа, што з'яўляецца, мабыць, галоўнай умовай і гарантам умацавання дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі і яе ўваходжання ў сусветную цывілізацыю народаў.

Па-другое, вывучэнне гістарычных і сучасных культур іншых краін. XX стагоддзе, асабліва яго апошнія дзесяцігоддзі, адзначаны ўсведамленнем, якое мае характар адкрыцця, што ў гісторыі кожнай краіны і кожнага народа можна знайсці свайго Арыстоцеля і Канфуцыя, Лютэра і Дантэ, Уільяма Шэкспіра і Міколу Гусоўскага, Джорджа Байрана і Максіма Багдановіча, Бертрана Расела і Францішка Скарыну.

Дзякуючы сучасным дасягненням тэхнікі ўпершыню ў гісторыі чалавецтва створаны такія сродкі масавай камунікацыі і інфармацыі і ў такой якасці і колькасці (у першую чаргу кнігі, фільмы, магнітафонныя запісы, дыяпазітывы і тэлепраграмы), якія могуць данесці культуру кожнай краіны да кожнага чалавека, да кожнага вучня і студэнта. У гэтай сувязі надзвычай важным, на наш погляд, з'яўляецца стварэнне нацыянальнай вучэбнай праграмы адукацыі ў галіне культуры, якая магла б быць узята за аснову ўсімі навучальнымі і асветніцкімі ўстановамі рэспублікі і стала неадрыўнай часткай у будучай нацыянальнай сістэме адукацыі ўвогуле. Ужо існуе мноства матэрыялаў для такой праграмы: запісы народнай музыкі і ўзораў вуснай народнай творчасці, паданняў і міфаў, легенд і казак, дыяпазітываў, дзякуючы якім мы можам пазнаёміцца з помнікамі мастацтва і архітэктуры, творамі свецкіх і рэлігійных мысліцеляў, рэцэптамі славутых нацыянальных страў. Ёсць вельмі цікавыя фільмы аб унікальных танцах і народных звычаях. Праблема заключаецца ў тым, што ўсе гэтыя матэрыялы ў значнай ступені або недаступны масам, або прызначаны выключна спецыялістам. Іх неабходна як мага хутчэй "пусціць" у народ. Нацыянальная навучальная праграма адукацыі ў галіне культуры павінна спалучацца з міжнароднай навучальнай праграмай адукацыі ў галіне культуры, стварэнне якой трэба паскорыць і якую ўмоўна можна было б назваць "Культуры свету".

І, нарэшце, па-трэцяе, адукацыя ў галіне культуры развівае цікавасць і творчыя здольнасці чалавека. Пазнаючы тайны працэсу, які патрабуе пошуку , самаадрачэння, рызыкі і адкрыцця, чалавек вучыцца да ўсяго падыходзіць творча і вынаходліва. Культурная адукацыя павінна займаць цэнтральнае месца ў адукацыі яшчэ і таму, што сістэмнае вывучэнне мастацтва, архітэктуры, літаратуры, філасофіі, этыкі, рэлігіі і народных рамёстваў фарміруе асобу. Таму вывучэнне гэтых навук, а таксама жыцця і творчасці іх лепшых прадстаўнікоў трэба ўводзіць паўсюдна, а не абмяжоўваць каледжамі і ліцэямі, куды трапяць няшмат з іх "выбраныя". На жаль, абазначыўшаяся ў апошні час тэндэнцыя на элітнасць адукацыі можа нанесці незаменныя страты інтэлектуальнаму і духоўнаму патэнцыялу рэспублікі.

Засвойваючы культуру сваёй краіны і культуры іншых народаў, вучні і студэнты змогуць выпрацаваць у сабе як цэласнае разуменне сусвету, так і глыбокую свядомасць. Гэта дазволіць не толькі пераадолець укаранёны цяпер вузкаспецыялізаваны і прагматычны падыход да адукацыі, прытупляючы нашы пачуцці і інтарэсы да творчасці і пазнання, але і дапамажа навучэнцам набыць жывую цікавасць да навучання, самаадукацыі, усвядоміць неабходнасць уважлівых адносін да каштоўнасцей і праў іншых народаў, без чаго немагчыма пакончыць назаўсёды ў свеце з расізмам і нацыяналізмам, варварствам і насіллем, стаць сапраўды свядомым і развітым чалавекам.

Зубра А.С.,
канд.філас.навук,
дацэнт

## ПЕДАГАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА ВЫКЛАДЧЫКА УНІВЕРСІТЭТА

Вылучэнне педагагічнай культуры як асаблівага феномена абумоўлена спецыфікай педагагічнай дзейнасці і бесперапынным павышэннем патрабавання да асобы выкладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ